жср 3205 07/209

Библиотека АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

# ГОЛАС СЕЛЯНІНА

ОРГАН СТАЛБЦОЎСКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 5(92) Нядзеля, 6 лютага 1944 г.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

Войска 1-го Украинского фронта в результате стремительного удара и умело проведенного маневра овладели крупными областными центрами Украины

**ЛУЦК и РОВНО**

и крупной железнодорожной узловой станцией

**Здолбунов**

## Информационное сообщение об очередном Пленуме ЦК ВКП(б)

На днях в Москве состоялся очередной Пленум Центрального Комитета ВКП(б).

Пленум ЦК рассмотрел предложения Совнаркома СССР о расширении прав Союзных республик в области обороны и внешних сношений и одобрил их для внесения на предстоящую Сессию Верховного Совета СССР.

Далее пленум обсудил вопросы организационного характера, подлежащие рассмотрению Сессии Верховного Совета.

Кроме того, пленум признал правильным решение соответствующих органов—заменить старый государственный гимн „Интернационал" новым государственным гимном „Союз нерушимый республик свободных" и сохранить гимн „Интернационал", как гимн Всесоюзной Коммунистической Партии (большевиков).

## 10 СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

28 студзеня адбылося ў Маскве адкрыццё 10-й Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Сесія зацвердзіла Дзяржаўны Бюджэт СССР на 1944 год, а таксама зацвердзіла справаздачы аб выкананні Дзяржаўнага Бюджэта за 1940, 1941 і 1942 гады.

Сесія даклада тав. МОЛАТАВА аб пераўтварэнні Народнага Камісарыята Абароны і Народнага Камісарыята Замежных Спраў з агульна-саюзных у саюзна - рэспубліканскія наркаматы. Сесія ухваліла, што кожная саюзная рэспубліка будзе мець свае рэспубліканскія вайсковыя фармацыі; Народны Камісарыят Абароны пераўтвараецца з агульна-саюзнага Народнага Камісарыята ў саюзна-рэспубліканскі. Таксама і Народны Камісарыят Замежных Спраў з агульна-саюзнага Наркамата пераўтвараецца ў саюзна-рэспубліканскі. Такім чынам у кожнай саюзнай рэспубліцы будзе Народны Камісарыят Абароны і Народны Камісарыят Замежных Спраў.

„Гэта пераўтварэнне—сказаў у сваім дакладзе тав. МОЛАТАЎ—азначае большае пашырэнне дзейнасці саюзных рэспублік, якое стала магчымым у рэзультаце іх палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзросту".

Сесія ўхваліла выбраць тав. ШВЕРНІКА Н. К. першым Намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

...Пераўтварэнне Наркамата Абароны і Наркамата Замежных Спраў з агульна-саюзных у саюзна - рэспубліканскія сведчыць аб паспяховай спеласці нацыянальных савецкіх сацыялістычных рэспублік. З другога боку гэта пераўтварэнне з'яўляецца вынікам аб'яднання ўсіх народаў СССР, іх згуртаванасці вакол магутнай партыі большавікоў, партыі Леніна-Сталіна.

...Я, грамадзянін БССР, я поўны гонарам і радасцю за свой гераічны народ, які застаўся цвёрдым і да канца верным ідэалам новага свету, абвешчаным Леніным і ажыццяўляемым Сталіным.

З артыкула ЯКУБА КОЛАСА народнага паэта БССР.

## Десять гитлеровских дивизий окружены Красной Армией

(Из оперативных сводок Совинформбюро).

Войска 2-го Украинского фронта, перейдя в наступление из района севернее Кировограда в западном направлении и войска 1-го Украинского фронта—из района юго-восточнее Белая Церковь в восточном направлении, прорвали сильно укрепленную оборону немцев и продвинулись навстречу друг другу на каждом направлении от 50-ти до 75-ти километров и расширили прорыв на каждом участке наступления до 160-175 километров по фронту.

В результате проведенной операции войска 1-го и 2-го Украинских фронтов соединились в районе Звенигородка - Шпола и тем самым замкнули кольцо окружения группировки противника, действующей севернее этой линии, в составе 9 немецких пехотных и 1-й танковой дивизии. Наши войска освободили более 300 населенных пунктов, в том числе города: Смела, Шпола, Звенигородка, Канев и Богуслав, райцентры Киевской области Ротмистровка, Лысянка, Мироновка, крупные ж. д. узлы Бобринская, Цветково, Мироновка и др.

Войска 1-го Украинского фронта, в результате стремительного удара подвижных соединений и пехоты и умело проведенного обходного маневра, овладели областными центрами Украины городами ЛУЦК, РОВНО, городом и крупным железнодор. узлом Здолбунов, а также с боями заняли более 230 других населенных пунктов.

Войска Ленинградского фронта, сломив сопротивление противника, овладели городом КИНГИСЕП.

## КАНТРОЛЬ ТАКСАМА НЕ ДАПАМОГ...

Колькі гітлераўцы не стараліся ў гэты вечар бясшкодна праехаць праз Н-скі адрэзак чыгуначнай дарогі — ім гэта не ўдалося. Раней яны выслалі кантрольны састаў. Усё ў парадку! Лінія, быццам „чыстая". Значыць можна смела ехаць. І паехалі. Ідзе паравоз, 2 пустыя платформы (на ўсякі выпадак) пасля толькі 16 вагонаў з гітлераўцамі.

Кантроль так і прайшоў, але каб жывыя фашысцкія галаварэзы праехалі — на гэта ўжо не дазволіла падрыўная група атрада „Октябр" на чале з тав. Д. Міна імі падкладзеная ўзарвалася якраз тады, калі на яе ўскочыў састаў з гітлераўцамі. 330 фашысцкіх сабак загінула. Дарога была бяздзейна 22 гадзіны.

Іа. К.

## У АДНУ НОЧ

Група партызан атрада імені Комсамола пад камандай тав. Кастуся Л. атрымала загад ад камандзіра атрада тав. Мікалая Е. каб знішчыць дротавую сувязь, спаралізаваць на некалькі дзён паразуменне фашысцкіх гарнізонаў.

Дабраўшыся да мейсца свайго задання партызаны дружна ўзяліся за працу. Раўнамерна гул пілаў і стук валячыхся падрэзаных тэлефонна-тэлеграфных стаўбоў запоўнілі глыбокую начную цішыню. На працягу трох кілометраў ні водзін стоўб не застаўся цэлым.

Адначасова мінёры т. т. Давід Б. і Сяргей Р. адыходзячы замініравалі дарогу. На іх міну наскочыла варожая машына. Пяць гітлераўцаў забіта, адзін ранены.

Кастусь К.

## ГРАМІМ ВАРОЖЫ ТРАНСПАРТ

Падрыўнікі атрада імені Калініна (камандзір тав. Ш.) пад камандай тав. Давіда Л. спусцілі пад адхос на працягу 5 дзён 3 варожыя эшалоны.

У першы дзень знішчылі паравоз і 7 вагонаў з гітлераўцамі. Праз 3 дні спусцілі састаў з вугалём. На трэцяй міны падрыўнікоў наскочыў эшалон з боепрыпасамі. Адзін паравоз і пяць вагонаў поўнасцю знішчаны.

## Военные действия в Италии

Штаб войск союзников в Северной Африке сообщает, что французские и американские части 5 армии продвинулись в горах западнее Кассино и вклинились на фронте в несколько километров в оборонительную линию противника. В секторе Анцио идут ожесточенные бои.

## ВЫСАДКА АМЕРИКАНСКИХ ВОЙСК НА МАРШАЛЬСКИХ ОСТРОВАХ

На Маршальских островах высадились американские войска. Несмотря на то, что американцы встретили сильное сопротивление, операции развиваются успешно.

— —

Шведская печать сообщает, что по полученным сведениям германский город Франкфурт-на Майне несколько раз подвергавшийся усиленным бомбардировкам авиации союзников, почти полностью разрушен. В старой части города не осталось ни одного уцелевшего дома. Жизнь в городе замерла. Полиция устроила настоящую охоту за рабочими, пытающие бежать из города.

— —

В течении января месяца союзная авиация сбросила на Берлин 9300 бомб.

## *Партызанская арыфметыка*

Дванаццаць — гэта больш чым два; трыццаць — гэта яшчэ больш. Гэтак вучылі нас у першых класах школы.

Іншай бывае наша, партызанская арыфметыка. Яна часта адкідвае старыя паняцці аб колькасці. Два — гэта больш чым дванаццаць, нават чым трыццаць! — гэтак даказалі на справе партызаны атрада „Мсціцель" (якім камандуе тав. Аляксей С.) таварышы Федар Ш. і Васіль Ш.

Па заданні камандавання свайго атрада палітрук Федар Ш. і партызан Васіль Ш. пайшлі ў вёску В. — тут-жа пад носам паліцэйскага участка. Даведалася аб гэтым паліцыя. У поўнай баявой гатоўнасці, з кулямётамі, яны выйшлі супроць двух партызан у якіх была адна дзесяцізарадка і адна звычайная вінтоўка. Фашысцкіх халуяў было больш трыццаці. Частка з іх уладзіла засаду, дванаццаць паліцманаў пачалі акружаць хату ў якой знаходзіліся партызаны.

...Выстралі кулямёты
З паліцэйскаю ахвотай
Залпы з кулямёта далі
Усе вокны застучалі.

Гэтак расказвае аб тым, што было далей, вясковы паэт. Паліцыя ўпэўнена, што ўжо закончыла з партызанамі, смела пачала наблажацца да хаты. Тут-жа да вакна падскочыў Федзька Ш. і з воклічам: „За Радзіму, за Сталіна!" кінуў гранату ў паліцэйскіх. Пасыпаліся партызанскія кулі. Паліцэйскі кулямёт адразу замаўчаў. Ціха стала таксама ў сялянскай хаце, дзе былі партызаны. Праз некаторы час паліцэйскія зноў асмяліліся, падыйшлі бліжэй да хаты, пераканаліся: у ёй пуста, нікога няма. Не дапамаглі ім кінутыя на ўсе бакі ракеты — след партызанаў прастыў. Іншы след аднак застаўся — след чорнай сабачай крыві двух забітых і аднаго раненага паліцэйскага.

— —

Два бывае больш чым дванаццаць, нават чым трыццаць. Асабліва тады, калі ў сэрцы партызан ёсць упэўненасць у перамозе і рашучасць не адступаць перад ворагам. Сведкамі гэтага з'яўляюцца нашы баявыя таварышы — партызаны Федзька Ш. і Васька Ш.

Г. С.

Рэдкалегія.